Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка”

# СУЧАСНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ГІСТАРЫЯГРАФІІ ГІСТОРЫІ

Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі
28 лістапада 2003 года

У 3-х частках

Частка 1

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мінск
2003

17. Абэцэдарскі Л., Сідарэнка А. За ідэйную чыстату нашых літаратурных пазіцый // Звязда, 1957. 12 студзеня; Абецедарский Л., Ефремова О., Корнейчук Е., Шабуня К. Вопреки историческим фактам // Коммунист Белоруссии, 1964. № 9
18. Верабей М. Ленінскі твор на старонках газеты "Наша ніва" // Полымя, 1963, №2 С. 132-136
19. Горбунов Т.С. Книгопечатание в Белоруссии конца XIX – начала XX вв. // 400 лет русского книгопечатания. 1564-1964. Т.1. М. 1964
20. Конон В. Демократическая эстетика Белоруссии (1905-1917). Мн., 1971; Конан У. Пачатак, які не забудзецца // Мастацтва Беларусі, 1986. №9.С. 20-24
21. Ермаловіч М. Слова пра "Нашу ніву" (да выхаду факсімільнага выдання) // Полымя, 1990. №2. С. 164-168; Сидаревич А. Антон Луцкевич: Главы из книги // Нёман, 1990. № 7; Сідарэвіч А. З жыцця Антона Луцкевіча // ЛіМ, 1991, 18-25 студзеня
22. Янка Купала і "Наша ніва" // Зб. матэр. Міжнароднай навуковай канферэнцыі 7-8 кастрычніка 1996. Мн., 1997
23. Тамсама. Станкевіч С. Савецкае асуджэнне "Нашай нівы" й спробы ейнае рэгаблітацыі С. 150-176; Сянькевіч В. Вытокі беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі і "Наша Ніва" С. 177-185
24. Смалянчук А. Беларускае пытанне і польскі рух (1905-1917) // Полымя, 1994. №6. с. 176-192; Смалянчук А. "Краёвасць" у беларускай і літоўскай гісторыі (1905-1940) // Беларускі гістарычны агляд, 1997. Т.4. сш. 1-2. с. 19-33; Смалянчук А. Краёвец Антон Луцкевіч (Выдавецкая дзейнасць А. Луцкевіча ў 1912-1915 гг. і "краёвая" ідэалогія) // Гістарычны альманах, 1998. №1. С. 27-51; Смалянчук А. Да пытання аб ролі палітычнай ідэалогіі ў развіцці беларускага нацыянальнага руху ў XIX – пач. XX стст. // Гістарычны альманах, 1999. №2. С. 3-19
25. Смалянчук А. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864-1917. Гродна, 2001
26. аўка А. "Наша ніва" – Лондан // Жывом! Старонкі беларускага самапазнання. Масква-Менск. 1997. С. 56-58
27. Напрыклад, у зборніку "Вяртання маўклівая споведзь. Постаці творцаў беларускай гісторыі ў кантэксце часу". Мн. 1994. змешчаны артыкулы: Бяляцкі А. У іпастасі літаратурнага крытыка: Антон Луцкевіч. с. 71-90; Янушкевіч Я. Неадменны сакратар: Вацлаў Ластоўскі. с. 91-121; Конан У. Прарок у сваёй Айчыне: Уладзімір Самойла. С. 169-190; Сідарэвіч А. З Айчынай і Богам у сэрцы: Адам Станкевіч. С. 203-211
28. Навойчык П.І. "Наша ніва" і літаратурна-грамадскі працэс на Беларусі пачатку XX ст. Дысертацыя абаронена на філалагічным факультэце БДУ ў 1996 г.



# НАЦЫЯНАЛЬНАЕ ПЫТАННЕ Ў БЕЛАРУСІ Ў 1905 – 1914 ГГ. (ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПРАБЛЕМЫ).

П. А. Трубчык
г. Мінск

Вывучэнне нацыянальнага пытання ў перыяд з 1905 па 1914 гг. мае вялікае значэнне для разумення працэсаў, якія адбываліся ў той час у грамадскім і палітычным жыцці краіны. У такім тэматычным і часавым разрэзе беларускае пытанне выступае як пытанне пра дзяржаўную прыналежнасць этнічнай тэрыторыі беларусаў, пра нацыянальна-культурную ідэнтыфікацыю і самаідэнтыфікацыю беларускага этнасу, пра яго палітычна-дзяржаўнае самавызначэнне.

Розныя аспекты абазначанага кола пытанняў знаходзілі адлюстраванне ў навуковай літаратуры, але на сённяшні дзень ні ў беларускай, ні ў савецкай гістарыяграфіі няма ніводнага комплекснага даследавання, якое б датычылася непасрэдна гэтай праблемы.

Аўтар артыкула ставіць наступную мэту: вызначыць ступень распрацоўкі ў беларускай і савецкай гістарыяграфіі нацыянальнага пытання Беларусі ў перыяд 1905 –1914 гг.

У дасавецкай літаратуры былі спробы разгледзець нацыянальнае пытанне ў Расійскай імперыі, у сувязі з чым закраналася і беларускае пытанне. Цікавая інфармацыя ёсць у працы Н. Брулова-Шаскольскай [1]. Яна разгледзела культуралагічныя і моўныя адрозненні вялікаросаў, беларусаў, украінцаў і выказалася аб неабходнасці ўліку гэтых асаблівасцей пры будаўніцтве Расійскай дзяржавы.

Адным з першых выданняў, блізкіх да нашай тэмы, быў зборнік навукова-публіцыстычных артыкулаў Я. Канчара "Беларускае пытанне" [2]. Аўтар вачыма беларуса прарасійскай арыентацыі разглядае гістарычныя, этнатэрытарыяльныя, сацыяльна-эканамічныя, культурна-моўныя, канфесійныя аспекты беларускай праблемы, выказвае ўласнае бачанне шляхоў пабудовы беларускай дзяржаўнасці.

У іншых публікацыях гістарычна-публіцыстычнага і мемуарнага характару, аўтарамі якіх з'яўляюцца А. Луцкевіч [3] і А. Цвікевіч [4], увага канцэнтруецца пераважна на гісторыі нацыянальнага руху. Пададзеныя ў іх шматлікія факты, дакументальныя звесткі асвятляюць найперш унутраныя працэсы ў руху, дзейнасць беларускіх партый і арганізацый, асобных лідэраў, але не заўсёды даюць уяўленне пра размах і выніковасць гэтай дзейнасці, пра рэальнае месца беларускага руху сярод іншых грамадска-палітычных сілаў, пра велічыню яго ўплыву на падзеі.

Такая тэматычная скіраванасць уласцівая і першым савецкім працам па гэтай праблематыцы, аўтарамі якіх былі А. Бурбіс, Ф. Турук, У. Ігнатоўскі, З. Жылуновіч, М. Доўнар-Запольскі – таксама выхадцы з беларускага нацыянальнага руху [5].



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Па меры ўмацавання ў СССР таталітарнай сістэмы адбывалася абсалютызацыя пазіцый партыі бальшавікоў па нацыянальнаму пытанню. Гэта рабіла немэтазгодным звяртанне даследчыкаў да вопыту партый, якія зышлі з палітычнай арэны, па ўжо "вырашанай" праблеме. У тых нешматлікіх працах, якія з'явіліся ў адзначаны час, даследавалася ў асноўным нацыянальная праграма бальшавікоў. Нацыянальная палітыка самадзяржаўя, праграмныя палажэнні па нацыянальнаму пытанню непралетарскіх партый, як правіла, асвятляліся часткова, у сувязі з іншымі праблемамі, з крытычных пазіцый [6].

З сярэдзіны 1960-х гадоў ва ўмовах агульнага "пацяплення" ў СССР ідэалагічнага клімату намеціўся паварот айчыннай гістарыяграфіі да больш сур'ёзнага аналізу этнапалітычных працэсаў перыяду 1905 – 1914 гг. У 1969 годзе выходзіць праца Я. Карнейчыка "Беларуская нацыя", дзе Беларусь і беларусы з'яўляюцца ўжо самастойным аб'ектам даследавання. Аднак матэрыял, які пададзены ў працы, вызначаецца крайняй аднабаковасцю ацэнак і аднастайнасцю выкарыстаных фактаў [7].

Значнай ўвагі заслугоўвае, выдадзеная у 1976 годзе, манаграфія Т. Ю. Бурмістравай і В. С. Гусаковай "Национальный вопрос в программах и тактике политических партий в России в 1905 – 1917 гг.". Аўтары абмежаваліся толькі агульнай характарыстыкай даследуемай праблемы. Крыніцазнаўчую базу даследавання склалі ў асноўным дакументы камуністычнай партыі і працы У. І. Леніна. Разам з тым, былі выкарыстаны архіўныя матэрыялы і перыядычны друк пачатку стагоддзя. Аўтарамі была зроблена важная выснова аб немагчымасці ігнаравання нацыянальнага фактару ў шматнацыянальнай дзяржаве [8].

У сярэдзіне 1990-х гадоў з'яўляецца шэраг прац, дзе аўтары даследуючы гісторыю палітычных партый, вывучаюць і іх пазіцыі па нацыянальнаму пытанню.

П. І. Брыгадзін даследаваў дзейнасць мясцовых эсараўскіх арганізацый да лютага 1917 г. [9].

Значны ўклад у распрацоўку тэмы "Нацыянальнае пытанне і неанародніцтва" зрабілі М. С. Сташкевіч, а пазней і У. Е. Казлякоў [10]. У іх працах глыбока і дэталёва разгледжаны праграмныя палажэнні і тактыка Беларускай сацыялістычнай грамады, беларускіх эсэраў і сацыялістаў-федэралістаў.

У другой палове 90-х гадоў цікавасць да гісторыі беларускай дзяржаўнасці і нацыянальнага руху значна ўзрастае.

У 1996 годзе М. В. Цуба ў дысертацыйным даследаванні на матэрыялах Беларусі разглядае гісторыю нацыянальнага руху ў перыяд з 1907 па люты 1917 гг. [11].

Пазней, у 1997 годзе А. Д. Тогулева абараняе дысертацыю па гісторыі ўтварэння і палітычнай дзейнасці Беларускай сацыялістычнай грамады, дзе таксама, закранае некаторыя аспекты нацыянальнага пытання Беларусі [12].



Увагі заслугоўвае манаграфія М. М. Забаўскага "Расійская Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1906 –1917 гг.)". Аўтар упершыню разгледзеў пазіцыі па нацыянальнаму пытанню дэпутатаў ад беларускіх губерняў. Акрамя таго, у працы даецца аналіз друкаваных органаў палітычных партый і груп, якія дзейнічалі ў Беларусі. Гэта дазваляе прасачыць узаемаадносіны і растаноўку палітычных сіл па нацыянальнай праблеме [13].

Агульную характарыстыку беларускага пытання ў перыяд з 1905 па 1914 гг. можна знайсці ў такіх калектыўных працах, як "Нарысы гісторыі Беларусі", "Энцыклапедыя гісторыі Беларусі" [14].

Такім чынам, мы бачым, што да нашага часу праблема нацыянальнага пытання Беларусі ў адзначаны перыяд амаль не распрацавана. Большасць вучоных разглядалі ў першую чаргу гісторыю нацыянальнага руху і палітычных партый і толькі закраналі адзначаную праблему ў агульным кантэксце.

## Літаратура:


1. Брюллова-Шаскольская Н. Национальный вопрос в России. Спб. 1917 г.
2. Канчер Е. С. Белорусский вопрос: Сб. статей. Пг., 1919.
3. Луцкевіч А. За дваццаць пяць гадоў (1903 - 1928): успаміны аб працы першых беларускіх палітычных арганізацый. Вільня. 1928. Ён жа Усходняя Беларусь: статыстычныя і гістарычныя матэрыялы. Мн., 1918.
4. Цвикевич А. Краткий очерк возникновения Белорусской Народной Республики. Киев, 1918; он же Беларусь: политический очерк. Берлин, 1919.
5. Стары Піліп [Бурбіс А.] Кароткі агляд беларускага нацыянальна-рэвалюцыйнага руху. // Вестник Народного комиссариата просвещения ССРБ. 1921. № 1. Бел. аддзел. С. 4 – 9; Турук Ф. Белорусское движение: Очерк истории национального и революционного движения белоруссов. М.,1921; Игнатовский В. Белоруссия: Территория, население, важнейшие моменты истории. Мн. 1924; Ён жа Гісторыя Беларусі ў XIX і ў пачатку XX ст. 3-е выд. Мн., 1928; Жылуновіч З. Два бакі беларускага руху // Полымя. 1923 № 3-4. С. 69-74; Доўнар-Запольскі М. В. Гісторыя Беларусі. Мн., 1994.
6. Драпкина Е. Национальный вопрос в царской России. М., 1930.
7. Карнейчык Я. І. Беларуская нацыя: Гістарычны нарыс. Мн., 1969.
8. Бурмистрава Т. Ю., Гусакова В. С. Национальный вопрос в программах и тактике политических партий в России в 1905 – 1917 гг. М. 1976.
9. Бригадин П. И. Эсеры в Беларуси (конец XIX в. – февраль 1917г.). Мн.: Згода, 1994.




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

10. Сташкевич Н. С. Белорусская партия социалистов-революционеров; Белорусская социалистическая громада; Белорусская партия социалистов-федералистов // Палітычныя партыі Беларусі. Дапаможнік для вывучаючых гісторыю Беларусі. Мн. : Згода, 1994; Козляков В. Е. Национальный вопрос и неонароднические партии: начало XX в. – конец 20-х гг. Мн., 2001.
11. Цуба М. В. Беларускі нацыянальны рух у перыяд паміж дзвюма дэмакратычнымі рэвалюцыямі (1907 – люты 1917 гг.): Аўтарэф. Дыс. ... канд. Гіст. Навук. Мн., 1996.
12. Тогулева А. Д. Беларуская сацыялістычная грамада: праблемы ўтварэння і палітычнай дзейнасці: Аўтарэф. дыс. ... канд. Гіст. Навук. Мн.,1997.
13. Забаўскі М. М. Расійская Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1906 –1917 гг.). Мн.. 1999.
14. Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. І. Мн., 1994 ; Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 1 – 6. Мн., 1995 – 2002. (выданне працягваецца).

## СЯЛЯНСТВА БЕЛАРУСІ ЧАСОЎ РЭВАЛЮЦЫЙ 1917 Г. У ПРАЦАХ І. М. ІГНАЦЕНКІ

І. М Рыжанкоў
г. Мінск

Кожнаму з чытачоў, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі часоў рэвалюцый, будзь ён прафесіянал або аматар, не можа не кінуцца ў вочы тая акалічнасць, што асноўная маса (калі не ўся) навуковых распрацовак падзей 1917 г., у тым ліку жыццядзейнасці беларускага сялянства, належыць аднаму чалавеку - акадэміку І. М. Ігнаценку. Наша ж задача ў іншым: вызначыць сутнасць аўтарскай канцэпцыі сялянскага руху ў Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцыях, выявіць адпаведнасць яго высноў па азначанай праблематыцы ісціне з улікам новых падыходаў і вызначыць арыенціры для яе далейшых навуковых распрацовак.

На нашу думку, высвятленне гэтых пытанняў немагчыма без уліку метадалагічных падыходаў, якімі карыстаўся вядомы даследчык, а таксама панаваўшай у грамадстве палітычнай атмасферы. Сталіншчына, якая ўкаранілася ва ўсіх сферах жыццядзейнасці савецкага грамадства, не магла не выявіць сябе і ў грамадскіх навуках, у прыватнасці, у напрамку вызначэння прыярытэтных тэм, ацэнак дзейнасці тых ці іншых сіл, асоб і г. д. Такім чынам, цэлыя пласты беларускай гісторыі перыяду Лютага і Кастрычніка апынуліся на заднім плане. А сялянскі рух тых часоў наогул не вывучаўся. Можна меркаваць, што гэта тэма "apriori" была аднесена ідэолагамі да ліку другаступенных, паколькі роля партыі бальшавікоў у ім была



нязначнай. Магчыма таму, І. М. Ігнаценка прысвяціў сваю кандыдацкую дысертацыю "Аднаўленне сельскай гаспадаркі Гомельскай губерні пасля грамадзянскай вайны" (1921-1925 гг.) [1] падзеям, калі гэтая роля была вызначальнай.

Нягледзячы на выкрыццё культу Сталіна, аўтарытэт КПСС заставаўся непахісным. Намаганнямі ўсіх падкантрольных ёй навуковых, грамадскіх, культурных і іншых устаноў аўтарытэт гэты мусіў узрасці яшчэ больш. Вядома, што маскоўскія і ленінградскія гісторыка-партыйныя цэнтры ўтрымлівалі "манаполію" у вызначэнні і распрацоўцы перспектыўных тэм даследванняў мінуўшчыны. Такім чынам, навукоўцы беларускай і іншых брацкіх рэспублік мусілі рухацца ў чотка азначаным фарватары даследчыцкай дзейнасці. Для іх асноўная праца пераўтваралася, па сутнасці, у пошук мясцовых матэрыялаў для пацвярджэння высноў, зробленых у Маскве або ў Ленінградзе. Так, пасля выдання П. Н. Собалевым у Маскве, у 1958 г. працы "Беднейшее крестьянство – союзник пролетариата в Октябрьской революции", праз 4 гады І. М. Ігнаценка апублікаваў сваю манаграфію "Беднейшее крестьянство – союзник пролетариата в борьбе за победу Октябрьской революции в Белоруссии" і на яе аснове ў 1964 г. абараніў доктарскую дысертацыю. Аўтар увёў у навуковае абарачэнне, дагэтуль невядомыя архіўныя крыніцы (фонды Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ, ЦГАОР СССР) і матэрыялы перыядычных выданняў 1917–1918 гг. Манаграфія абапіралася на грунтоўную фактычную базу, змяшчала шматлікія статыстычныя дадзеныя. Маштабнасць твора ўзмацнялася шырокім спектрам даследваемых праблем: дзейнасцю партый на вёсцы, выбарамі ва Устаноўчы сход, усталяваннем Савецкай улады, склікіканнем Усебеларускага з'езда і многім іншым.

Нават выкарыстоўваючы марксісцка-ленінскую метадалогію ў ацэнках сялянскага руху, даследчык здолеў абвергнуць сцвярджэнні некаторых аўтараў аб быццам вялікім уплыве бальшавікоў у сялянскіх арганізацыях вясной 1917 г. [2, с. 131] [3] [4] [5]. Так аўтар адзначаў, што "у рэчаіснасці бальшавікоў не было не толькі ў сялянскіх камітэтах, але нават і ў Саветах рабочых і салдацкіх дэпутатаў, за выключэннем Мінскага" [2, 132]. Наогул, як вынікала з яго (Ігнаценкі) працы, час пераходу сялянства на бок бальшавікоў значна пазнейшы – 1918 год [2, 252]. З выхадам названай манаграфіі Ігнаценкі падобныя палажэнні паступова выцеснялі з навуковага абароту неаб'ектыўныя, хвалебныя на адрас бальшавікоў тэзісы.

Вядома, што аўтар не здолеў адыйсці ад панаваўшых негатыўных ацэнак небальшавіцкіх партый, а праз іх дзейнасць і ўсяго характару Лютаўскай рэвалюцыі. Паставіўшы задачай "вывучэнне бліжэйшых саюзнікаў рабочага класа – пралетарскіх і напалову-пралетарскіх мас вёскі" ён не выявіў арганізацыйныя формы (якіх па сутнасці не было створана) гэтых пластоў, не ахарактарызаваў іх узаемаадносіны з сялянамі і г. д. Варта заўважыць, што арганізацый батракоў ці "напалову-пралетарскіх мас вёскі"



РЕПОЗИТОРИЙ ГГПУ